**СТРЫ́ГА**, міфічная істота, чараўніца, якая турбуе цяжарных і падмяняе маткам дзяцей (параўнайце з *Лоймаю*), падкідваючы ім замест добрага і тоўстага худое і плаксівае. Уяўлялася худой бледнай жанчынаю высокага росту з распушчанымі валасамі, з запалымі шчокамі і зялёнымі кашэчымі вачыма. С. не мае сталага жыхарства. Вечарамі яна ходзіць па вёсках з аднаго двара на другі. Схапіўшы дзіця, шматае яго так, каб маці пачула ягоныя крыкі. Ад магчымых нападкаў С. дзяцей купаюць перад захадам сонца, стараючыся выліць ваду, пакуль сонца не села. Раззлаваная С. можа знявечыць дзіця і на вачах ва ўсіх разбіць яму галаву аб камень. Цяжарныя жанчыны з мэтаю задобрыць С. запрашалі яе да сябе ў хату на час родаў. Калі С. з'яўлялася, яе ўшаноўвалі, каб дзіця нарадзілася цэлае. Згодна з нар. перакананнямі, С. не баіцца нават святой вады. Паратунку ад гэтай чараўніцы шукалі ў знахароў.

*Літ.*: Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния. СПб., 1863. Ч. 1. С. 823; Киркор А. Живописная Россия. Т. 3, ч. 2. Белорусское Полесье. СПб.; М., 1882. С. 274.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ